**Э. К. Дарашэвіч,**
*прафесар кафедры этналогіі і фальклору,*
*доктар філасофскіх навук, прафесар*

# ФАРМІРАВАННЕ НОВАЙ ПАРАДЫГМЫ ЭТНАМАСТАЦКАЙ АДУКАЦЫІ

Апошнім часам праблема захавання субкультур носьбітаў беларускага мастацтва вуснай традыцыі і актуальных праяў традыцыйнай культуры ў цэлым усё больш непакоіць грамадства, і асабліва прафесарска-выкладчыцкі корпус. Справа ў тым, што гэта праблема патрабуе намаганняў спецыялістаў, якія *здольныя вырашаць пэўнага класа прафесійныя задачы* ў галіне традыцыйнай культуры – валодаюць кампетэнцыямі (ад лац. competo – *дамагаюся, адпавядаю*) па яе даследаванні і актуалізацыі. У гэтай сувязі канферэнцыя «Кампетэнтнасны падыход у вышэйшай адукацыі: праблемы і перспектывы» своечасовая і актуальная як для спецыяльнасцей у галіне этнічнай культуры, падрыхтоўку па якіх забяспечвае БДУКМ, так і для ўсёй этнамастацкай адукацыі ў краіне.

Наша агульнатэарэтычная і звязаная з ёй практыка-арыентаваная падрыхтоўка мае значныя недахопы ў параўнанні з еўрапейскім, а тым больш сусветным узроўнем. Так, галоўным тэарэтычным прадметам спецыялістаў па этнакультуры і этнамастацтве згодна з Балонскай сістэмай з’яўляецца культурная антрапалогія, а тое, што рэпрэзентуе наша культуралогія з далучэннем Беларусі да Балонскага працэсу, уяўляе сабой асобныя дзве дысцыпліны – «Тэорыю культуры» (Theory of culture) і «Гісторыю культуры» (History of culture). Вядома, уваходжанне ў Балонскую сістэму патрабуе паступовага пераходу да яе патрабаванняў. А паколькі культурная (сацыяльная) антрапалогія абапіраецца не на агульнатэарэтычныя разважанні, а на палявыя (ці канкрэтна сацыякультурна-антрапалагічныя) даследаванні, яна асабліва вельмі блізкая і прыдатная для кампетэнтнасна-арыентаванай падрыхтоўкі па народным мастацтве, этналогіі і фальклоры.

На мой погляд, менавіта кафедра этналогіі і фальклору, на якой перманентна вядуцца палявыя даследаванні і ўжо больш за дзесяць год выкладаецца курс «Культурная антрапалогія», павінна паступова пераходзіць да падрыхтоўкі спецыялістаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(на ўзроўні магістратуры) па гэтай спецыяльнасці і ўводзіць дысцыпліну ў больш шырокі, агульнаўніверсітэцкі кантэкст. Гэта будзе адпавядаць і Балонскаму працэсу, і сусветным адукацыйным тэндэнцыям пераходу (у рэчышчы кампетэнтнаснага падыходу) ад «ведаў дзеля ведаў» да вывучэння сапраўдных жыццёвых працэсаў, «ведаў дзеля практычнай дзейнасці». Гэтыя перамены ўжо наспелі, яны адчуваюцца найбольш прагрэсіўнай, свядомай часткай прафесарска-выкладчыцкага корпуса. Што тычыцца айчыннай этнамастацкай адукацыі, праца па пашырэнні дысцыпліны «Культурная антрапалогія» для забеспячэння рознабаковых сфер спецыяльнасці ў галіне этнічнай культуры набывае мэтава-змястоўную акрэсленасць. Больш за тое, кафедра перанесла ідэі гэтага вучэбнага прадмета і на агульнанацыянальны ўзровень, падтрымаўшы прапанову аб наданні фальклорнай канферэнцыі БДУКМ статусу канферэнцыі памяці сусветна вядомага беларускага аўдыявізуальнага антраполага Зінаіды Мажэйкі.

Аналіз большасці айчынных кандыдацкіх і доктарскіх прац (напрыклад, па культуралогіі і іншых гуманітарных дысцыплінах), у якіх разглядаюцца розныя аспекты этнічнай культуры, паказвае, што, па сутнасці, яны па змесце і прадмеце бліжэй да культурнай антрапалогіі. Трэба паступова пераходзіць да больш пэўных класіфікацый пры падрыхтоўцы адпаведных спецыялістаў і больш аналізаваць і выкарыстоўваць замежныя працы, асабліва англамоўныя, каб не было так, што пераважаючыя спасылкі на замежныя выданні ў бібліяграфічным спісе падаваліся праз рускамоўныя пасрэднікі і выклікалі папрокі пры абароне дысертацый.

Натуральна, гэта патрабуе большай сувязі выпускаючых кафедр з кафедрай замежных моў і кафедрай этналогіі і фальклору, што карысна як для выкладчыкаў, так і для студэнтаў. Напрыклад, агульны грунтоўны курс па «Культурнай антрапалогіі», на мой погляд, нарэшце зрушыць вучэбны працэс універсітэта ў напрамку фарміравання кампетэнтных спецыялістаў па этнакультуры, у якіх краіна сёння мае патрэбу. Правамочна праводзіць агульныя інтэграваныя мерапрыемствы па канкрэтных тэмах, каб у рэшце рэшт дасягнуць еўрапейскага ўзроўню ў падрыхтоўцы спецыялістаў.

Сацыякультурная рэчаіснасць XXI ст. (глабалізацыя, гіперурбанізм, адкрытасць і дасціпнасць інфармацыі пра ўсе этна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуры свету) патрабуе, каб спецыялісты ў розных напрамках этнамастацкай адукацыі (выкладчыкі народнай музыкі, народнай харэаграфіі, народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва) мелі не толькі вузкапрафесійныя веды, уменні, навыкі, але і бачылі сваю дзейнасць (і ўвогуле мэту і сродак сваёй дзейнасці – этнамастацтва беларусаў) у шырокім культурна-антрапалагічным сусветным кантэксце. Сучасная парадыгма этнамастацкай адукацыі ўключае ў сябе метадалагічна выверaную *сістэму ўзаемадзеяння* розных бакоў: а) *агульнаэстэтычнага* і *этнакультурнага* выхавання; б) *агульнай* педагогікі і *этна*педагогікі; а сам працэс адукацыі (асабліва на першых этапах) павінен ажыццяўляцца выключна *на дакументальнай аснове* (на матэрыялах мясцовых фальклорных экспедыцый), пры ўліку непаўторнасці кожнай *рэгіянальнай* традыцыі. Да таго ж апошнія даследаванні ў тэорыі мастацтва абапіраюцца на: а) дамінанту прэнатальнага фактару ў фарміраванні мастацкага светапогляду [3, с. 88], пры ўліку якога вялікую ролю адыгрывае этнічнасць маці будучага дзеяча мастацтва; б) дамінанту архаічных этнаархетыпаў культуры пры фарміраванні індывідуальнага мастацкага стылю асобы [1, с. 39]. Такім чынам, ад этнакультуры ў мастацкай адукацыі пазбавіцца і немагчыма, і немэтазгодна.

На маю думку, спецыялізацыя «этнафоназнаўства» напрамку спецыяльнасці «народная творчасць (фальклор)», па якой вядзецца падрыхтоўка на кафедры этналогіі і фальклору, мае асаблівае значэнне ў святле тэмы артыкула і тэмы канферэнцыі. За дзесяцігадовы перыяд падрыхтоўкі па ёй накоплены значны станоўчы вопыт этнаадукацыі (прызнаны на рэспубліканскім і міжнародным узроўні [4, с. 281]). А менавіта ў галіне сучаснай этнамастацкай адукацыі Беларусь мае нявыкарыстаны патэнцыял. Што я маю на ўвазе. У выніку гістарычных і іншых абставін лёс нас скіроўваў апошнім часам з большага на ўсходні культурны напрамак, і, адначасова, не хапала ні сродкаў, ні магчымасцей грунтоўна распрацоўваць заходнія «брэнды» і напрамкі адукацыі. Таму нам наканавана шукаць свае шляхі ў прыярытэтах і экспарце адукацыйных паслуг. Заўважу, гэта не паліталагічныя ці эканагічныя тэзы, я застаюся ў межах гісторыі і тэорыі культуры, у нетрах нашай беларускай глыбіннай культуры і яе магчымасцей, і, зыходзячы з аб’ектыўных абставін, лічу, што ў перспектыве нашым брэн-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дам, у тым ліку адукацыйным, усё больш будзе станавіцца народная культура ў шырокім сэнсе, асабліва аўтэнтычны беларускі фальклор.

Аўтэнтыка сёння актуалізуецца для ўсяго Сусвету, і «кожная вывучаная традыцыя (і яе мадыфікацыя, развіццё, сінтэз з сучаснасцю), бясспрэчна, прапануе нешта карыснае для гістарычнага вопыту і стратэгіі выжывання чалавецтва ўвогуле» [2, с. 11]. Але Еўропа, на маю думку, сёння амаль цалкам страціла ўсё істотнае і «жывое» ў галіне традыцыйнай культуры, таму этнаадукацыя ў рэгіёнах, дзе захаваўся аўтэнтычны фальклор у «жывым» выглядзе (у тым ліку і ў Беларусі), становіцца ў перспектыве актуальнай для ўсяго еўрапейскага кантынента.

Усё азначанае вышэй было ўлічана пры фарміраванні тэматычнага плана па дысцыпліне «Культурная антрапалогія» для студэнтаў напрамку «фальклор», якую я выкладаю апошнія некалькі год. У межах дадзенага курса неабходна пазнаёміць будучых спецыялістаў са спецыфікай універсітэцкай адукацыі, але трэба і паказаць студэнтам перспектывы іх як збіральнікаў аўтэнтычнага фальклору, яго захавальнікаў і інтэрпрэтатараў. Прычым ажыццявіць гэта варта не толькі ў мэтах навуковых і дыдактычных, але і ў шырокім практычна-вытворчым аспекце, звязаным з дзейнасцю сучасных дзяржаўных інстытутаў. Таму шмат тэм дысцыпліны прысвечана сувязям фальклярыстаўпрактыкаў з дзяржаўнымі ўстановамі культуры і грамадскай супольнасцю. Гэта павінна садзейнічаць усведамленню іх прафесійнай годнасці і адказнасці перад грамадствам, суайчыннікамі.

Акрамя стандартных раздзелаў («Культурная антрапалогія як навука», «Культура і адаптацыя», «Культура пазнання», «Паводзінная культура», «Патэнцыял антрапалагічных даследаванняў») дысцыпліна «Культурная антрапалогія» мае раздзелы і тэмы, прысвечаныя актуальным аспектам этнакультуры («Традыцыйная культура і сучаснасць», «Традыцыйная культура: асаблівасці ўспрымання і мыслення носьбітаў традыцыі і даследчыкаў», «Праблема мадэрнізацыі традыцыйных грамадстваў»).

Такім чынам, пры выкладанні дысцыпліны «Культурная антрапалогія» для студэнтаў напрамку «фальклор» была ўпершыню распрацавана парадыгма выкладання аналітыкі і агульнай метадалогіі сучаснай даследчай і практычнай дзейнасці для спецыялістаў галіны захавання субкультуры мастацтва вуснай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

традыцыі. Лічу, што трэба дапрацоўваць і ўдасканальваць гэтую парадыгму, распаўсюджваць яе на іншыя спецыяльнасці, каб яна стала больш універсальнай. У той жа час у рэчышчы ўдасканалення кампетэнтнаснага падыходу ў этнамастацкай адукацыі трэба палепшыць каардынацыю паміж узаемадзеючымі дысцыплінамі БДУКМ, напрыклад культурнай антрапалогіяй і культуралогіяй. Каб не было характэрным сённяшняе становішча, калі ў студэнтаў факультэта традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва ў якасці формы кантролю ведаў – толькі залік па культуралогіі і мала гадзін на культурную антрапалогію. Сёння трэба даваць фундаментальныя веды па гісторыі і тэорыі культуры і аб узаемадзеянні фальклорнай свядомасці і астатняй культуры. Толькі так можна сканструяваць актуальную парадыгму кампетэнтнаснага падыходу ў этнамастацкай адукацыі.


1. *Алпатова, А. С.* Архаика в мировой музыкальной культуре / А. С. Алпатова. – М. : Экон-Информ, 2009. – 203 с.

2. *Дарашэвіч, Э.* Тэорыя фальклору / Э. Дарашэвіч // У тэзаўрусе Беларусі : да 80-годдзя Энгельса Дарашэвіча. – Мінск : Чатыры чвэрці, 2011. – С. 10–80.

3. *Жуковский, В. И.* Теория изобразительного искусства / В. И. Жуковский. – СПб. : Алетейя, 2011. – 495 с.

4. *Калацэй, В.* Дзейнасць па захаванні нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацваў (БДУКМ) / В. Калацэй // Фалькларыстычныя даследаванні. Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі : зб. арт. / пад навук. рэд. Р. М. Кавалёвай, В. В. Прыемка. – Мінск : РІВШ, 2010. – Вып. 7. – С. 277–283.



**А. В. Макаров,** *профессор кафедры*
*проектирования образовательных систем*
*ГУО «Республиканский институт высшей школы»,*
*кандидат философских наук, профессор*


## КОМПЕТЕНТНОСТНО-ОРИЕНТИРОВАННЫЕ МОДЕЛИ ПОДГОТОВКИ ВЫПУСКНИКОВ УВО: БОЛОНСКИЙ КОНТЕКСТ И НАЦИОНАЛЬНЫЕ ПРИОРИТЕТЫ

Республика Беларусь в последнее время проявляла значительный интерес к Болонским преобразованиям, происходящим в Европейском пространстве высшего образования. Более

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ